ПГПТКМ

УО «ПИНСКИЙ ГПТК МАШИНОСТРОЕНИЯ»

# Методический вестник

Выпуск № 6/76 28 февраля 2019 г.

## В этом выпуске:


| | |
|---|---|
| На ваших плечах защита | 1 |
| Какой мы хотим видеть нашу Беларусь через 10 лет | 2 |
| Беларусь – краіна моладзі | 2 |
| Малая радзіма - сапраўдны падмурак для станаўлення | 2 |
| Учебно-методическая неделя | 4 |
| Награждение студенческих, волонтёрских отрядов | 5 |
| Выбираем профессию - выбираем будущее | 6 |
| Профориентация в шестой школьный день | 6 |





## На ваших плечах защита…

День защитников Отечества и Вооруженных Сил Республики Беларусь – самый особый праздник в году. Этот день по праву считается днем мужества и героизма всех поколений защитников Отечества, которые отстояли независимость родной земли.

Этот поистине всенародный праздник глубоко значим для всех юношей нашего колледжа и несет в своем содержании символическое единение прошлого и настоящего.

Торжества, посвященные Дню защитников Отечества, берут свое начало с прошлого века. В этот день чествовали всех без исключения мужчин колледжа, ведь независимо от их возраста и наличия армейского звания каждый из них готов вступить в борьбу за мир на родной земле.

Традиционно 23 февраля 2019 г. в актовом зале колледжа состоялось праздничное мероприятие «На ваших плечах защита…». Ответственными за мероприятие выступила группа обучающихся № 11Т.

В этот праздничный день было сказано много тёплых слов и поздравлений в адрес работников. По старой традиции заместитель директора по учебной работе Гореглад Валентина Романовна и председатель профсоюзного комитета Кобринец Наталья Владимировна пожелали всем причастным к этому дню здоровья, счастья и успехов в работе. Лучшим из них по итогам 2018 г. были вручены дипломы и грамоты.
















**Дорогие наши защитники!**

От всего сердца поздравляем вас с праздником!
Желаем смелых решений и больших побед!
Пусть в делах вам сопутствуют удача и успех, а в ваших домах царят мир и благополучие!

# Какой мы хотим видеть нашу Беларусь через 10 лет

Учащиеся колледжа приняли участие в Республиканской акции «Пишем книгу вместе. Какой мы хотим видеть нашу Беларусь через 10 лет».

Цель акции – формирование у молодёжи патриотизма, гражданского самосознания, общечеловеческих ценностей, уважения к традициям, истории и культуры народа, развитие творческих навыков.

В книгу войдут лучшие и интересные работы.





## Беларусь – краіна моладзі

*Эссе*

Беларусь праз дзесяць гадоў – здаровае і чыстае асяроддзе, а гэта значыць, што ўжо сёння кожны з нас павінен берагчы прыродныя рэсурсы і як мінімум – збіраць другасную сыравіну і раздзяляць адходы.

Я бачу, як перапіс насельніцтва краіны ў 2029 годзе паказвае, што ў Беларусі колькасць жыхароў дасягнула 10 мільенаў чалавек. Гэта значыць, беларусаў стала больш, а таму будзе жыць родная мова і развівацца нацыянальная культура.

Думаю, што праз дзесяць гадоў не застанецца ні адной краіны ў свеце, у якой бы не ведалі пра Беларусь і не захацелі прыехаць паглядзець на старажытную і багатую гісторыю, самабытную культуру і прыродныя багацці. Лічу, што Беларусь пryме і правядзе на высокім узроўні шмат сусветных мерапрыемстаў і пакажа свае дасягненні ў спорце, адукацыі, мастацтве.

Ганаруся, што вучуся і буду працаваць у Беларусі. І праз дзесяць гадоў Беларусь застанецца суверэннай дзяржавай, моцнай прэзідэнцкай рэспублікай, міралюбівай краінай, актыўным удзельнікам міжнародных зносін.

*Д'ячок Данiл, навучэнец першага курса*




## Малая радзіма - сапраўдны падмурак для станаўлення

*Творческая работа*








Сучаснае студэнтцкае жыццё… Калі глядзіш на цяперашні свет, то міжволі кідаеш позірк на месца, дзе ты нарадзіўся і жывеш. І тая маленькая, зусім непрыкметная кропачка ў гэтым вялікім свеце – такая родная сэрцу, бо гэта твая Радзіма. Што пасееш, тое і пажнеш, казалі нашы продкі. Хочаш адтачыць вастрыню розуму, яснасць думкі, хочаш быць карысным сваёй малой радзіме, дык пачынай самастойна дапамагаць сваёй любай бацькаўшчыне дзейснымі ўчынкамі, патрыятычнымі намаганнямі, захаваннем мясцовых каштоўнасцей, звычаяў і ўкладу.

Моцнай ніткай гэтыя каштоўнасці звяжуць усё жыццё з дзеяннямі і ўчынкамі на карысць любай Радзіме. А для кожнага з нас малая радзіма – самая прыгожая і лепшая, тут самыя квяцістыя сады, найлепшыя краявіды, непаўторны водар, што так і вабіць да здзяйснення неверагодных мар.

Мая радзіма - гэта горад Пінск, што раскінуўся ўздоўж маляўнічай і паўнаводнай прыгажуні-рэчкі Піны на некалькі кіламетраў.

Старэйшыя людзі расказваюць шмат легенд не толькі аб паходжанні назвы гэтага гістарычнага горада, але і пра сімвал – палешука, помнік якому знаходзіцца ў самым цэнтры горада і надае яму асаблівы каларыт, пра знакамітых і выдатных дзеячаў горада, што прынеслі яму не толькі карысць, але і праславілі свой куточак далёка за яго межамі.

Горад гэты прыгожы ў розную часіну года. Але найпрыгажэйшы ён летам, калі ўздоўж Піны паўстаюць нібы казачныя зданні квітнеючыя свечкі-каштаны, гарадскі парк і прыбярэжныя хмызнякі напаўняюцца мноствам птушыных галасоў, якія перачакалі сцюдзеную зіму і вярнуліся на сваю малую радзіму працягваць свой птушыны род, напаўняючы душы пінчукоў сваім змястоўным і глыбокім спевам. Звонка заліваюцца салаўі, трасковуць у траве конікі, жужжаць чмялі, клякочуць дзесьці здалёк буслы, рамантуючы свае гнёзды. На душы становіцца светла, прыемна ад такога жыццясцвярджальнага ансамбля яркіх эмоцый.

Не аднойчы з сябрамі-аднагрупнікамі мы з асалодай слухалі шэлест лістоты, птушыныя напевы, плёскат вады, адпачываючы на ўлонні любімай ракі.

Цяперашні свет так хут-

ка мяняецца, штогод павялічваецца колькасць інфармацыі, неабходнай чалавеку. Час ад часу мне здаецца, што сучасны навучэнец не паспявае бегчы за гэтым “цягніком ведаў”. Нездарма ў дачыненні да нашага каледжа ў мяне ўзнікла такая асацыяцыя – “цягнік ведаў”. Успамінаецца, што пачынаў я сваю школьную “кар’еру” са станцыі “Буквар”, дзе ўсё было неверагодна прыгожым, ружовым, цікавым, добрым. Кожная дэталька таго прыпынку нібы звала і вяла ў цікавае падарожжа. Менавіта на гэтай станцыі склалася і першае маё ўяўленне пра малую радзіму, багаты і любы край.

Затым была наступная станцыя, больш сур’ёзная, – “Загадкіна”, дзе з’явілася шматлікая колькасць пытанняў, на якія мы, вучні, спяшаліся як мага хутчэй знайсці адказ. Цяпер ужо значэнне выразу “малая радзіма” пачынала набываць больш глыбокі сэнс. І галоўнае, што мы павінны былі не проста авалодваць новай інфармацыяй, а ведаць, дзе яе аператыўна знайсці і як правільна прымяніць, што павінны мы зрабіць, каб наша радзіма стала яшчэ прыгажэйшай?

У кожным канкрэтным жыццёвым выпадку важна не колькасць пачутай новай інфармацыі, а ўменне выкарыстаць усе патрэбныя табе рэсурсы для выражэння існуючых праблем. Менавіта таму і прыходзіцца ўключацца ў актыўны пошук ведаў – па прынцыпе “браць веды”, а інакш застанешся ты па-за бортам імклівага і прагрэсіўнага сучаснага жыцця. Так непрыкметна падабраўся я са сваім філасофскім роздумам пра жыццё да наступнага прыпынка– станцыі – “Прафесійная”.

Мне ўжо амаль сямнаццаць гадоў. Цяпер я ўжо навучэнец каледжа, як мне здаецца, даволі самастойны чалавек, які дакладна ведае, што хоча ажыццявіць сваю ідэю стаць добрым спецыялістам, што ўзнікла ў мроях-снах, праз паўмістычныя азарэнні поруч з думкамі пра сэнс жыцця, малую радзімусамыя розныя чалавечыя заняткі, разам з ідэаламі дабра, міласэрнасці, шкадавання, любові.

У гэтым выбары ёсць свая рацыя. Мой дзядуля быў славутым на ўсё наваколле кавалём. Ён праславіў сваю старонку рознымі жалезнымі вырабамі. Я ўсе летнія канікулы праводзіў у вёсцы, што непадалёк ад горада і з вялікім задавальненнем назіраў за яго працай. У мяне нават і ў думках не было, што мая мара здзейсніцца. Я не ведаў такой навучальнай установы, дзе вучылі гэтай справе. Аднойчы, у канцы школьнага навучання, класны кіраўнік, прапанавала класу, у якім я вучыўся, з’ездзіць на экскурсію ў Пінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж машынабудавання. Адгукнуліся на яе прапанову не ўсе, казалі што рабіць у ПТВ няма чаго, але я вырашыў проста папоўніць сваю інфармацыйную запатрабаванасць яшчэ і гэтай інфармацыяй.

У каледжы нас вельмі прыветліва сустрэла намеснік дырэктара, якая азнаёміла з навучальнай базай, рознымі кабінетамі, а далей усё і пачалося.

Мы трапілі ў вытворчую майстэрню “Кавальская справа”. Майстры вытворчага навучання з такім захапленнем расказвалі нам пра тое, чым займаецца сучасны каваль, паказвалі вырабы, зробленыя навучэнцамі: каваныя вароты, кветачніцу, дачныя вугалкі, а якое тут стаяла казачнае люстэрка. Ну, дзіву даешся насколькі пайшла наперад кавальская справа. Я нават адчуў вялікі гонар за мой палескі куточак, дзе жывуць сапраўдныя майстры сваёй справы. На нейкі момант мне падалося, што я трапіў у сапраўдную казачную краіну…

Экскурсія закончылася, пачаліся вучнёўскія будні, а я працягваў думаць пра тое, што мяне так уразіла. Быў нават нейкі момант разгубленасці, але, атрымаўшы дакумент аб базавай адукацыі, я канчаткова вырашыў: буду кавалём, як мой дзед. Гэта і ёсць тая канчатковая станцыя – станцыя “Прафесійная”.

Хутка бяжыць навучанне ў каледжы. Кожны дзень навучэння станавіўся новай прыступкай да прафесійнага авалодвання любімым заняткам. У мяне ўжо ёсць свае планы на перспектыву.

Калі наша настаўніца беларускай мовы прапанавала напісаць сачыненне пра гэта, то я доўга не думаў, не шукаў адказ на гэтае пытанне, бо адказ на яго ляжаў на самай паверхні. Мне засталося толькі на аснове сваіх успамінаў даказаць сур’ёзнасць гэтага выбару.

Сёння я канчаткова ўпэўнены, што выбар зроблены правільна. Застаецца толькі спадзявацца, што цяперашні мой маленькі сакрэт стане явай ужо праз некалькі гадоў і прынясе карысць маёй любай Радзіме, бо як жыць, дык жыць для Беларусі.

*Ігнатовіч Уладзіслаў,*
*навучэнец*
















# Учебно-методическая неделя по специальностям: «Механическая обработка металла на станках и линиях», «Технология обработки металлов давлением»













Учебно-методическая неделя по специальностям: «Механическая обработка металла на станках и линиях», «Технология обработки металлов давлением» состояла из комплекса различных мероприятий, которые были обсуждены на заседании методической комиссии и утверждены в установленном порядке.



Проведенные мероприятия: выставка газет и плакатов, выставка кузнечной продукции наших обучающихся «Куй кузнец, рази ударом…» и конкурс профессионального мастерства были направлены на углубление и совершенствование знаний, умений навыков учащихся, повышение интереса к получаемым квалификациям «Токарь», «Фрезеровщик», «Кузнец ручной ковки».

Участие в неделе помогает так же развивать творческую деятельность, способствует росту профессионального мастерства преподавателей и мастеров производственного обучения колледжа.



Все запланированные мероприятия прошли интересно и увлекательно.

Состоялась выставка газет «Моя профессия – машиностроитель», выставка кузнечной продукции наших обучающихся «Куй кузнец, рази ударом…».

В рамках учебно-методической недели на высоком методическом уровне было проведено открытое бинарное занятие по производственному обучению мастерами п/о Ильчуком М.Г. и Скалпешкиным А.В.





Конкурс профмастерства по квалификации «Фрезеровщик» проводился в два этапа. Теоретический тур проходил в фрезерной учебно-производственной мастерской по ул. Технической. По результатам тура были отобраны лучшие учащиеся группы № 352 в количестве шести человек, имеющие высокие учебные достижения по данной квалификации, они выполняли тестовые задания по предметам профессионального блока.

Для участия в конкурсе профмастерства по квалификации «Фрезеровщик» мастером производственного обучения Скалпешкиным А.В. были отобраны лучшие учащиеся группы № 352, имеющие



высокие учебные достижения по данной специальности. Практическая часть задания заключалась в изготовлении детали повышенной сложности, предусмотренной квалификационными требованиями. При этом учитывались соблюдение ТБ, технологии, скорость, мастерство и качество работы.

Учащийся группы № 352 Аринов Илья показал высокие достижения сразу в двух этапах конкурса и стал победителем, второе и третье места были присвоены учащимся группы № 352 Бакисову Дмитрию и Яруте Алексею.

Конкурс профмастерства по квалификации «Токарь» проводился также в два этапа. Теоретический тур проходил в токарной учебно-производственной мастерской по ул. Техническая, 3. Были отобраны учащиеся групп второго, третьего курса, групп ТУ, имеющие высокие учебные достижения по данной квалификации, вы-

полнявшие задания по предметам профессионального модуля.

Для участия в практическом туре конкурса ма-



стерами производственного обучения были отобраны учащиеся групп № 261, № 361, 061-18, имеющие высокие учебные достижения по данной специальности.

Учащийся группы № 361-16 Воробьев Артем в личном зачете показал высокие достижения на двух этапах конкурса и стал победителем, второе и третье места были присвоены группам № 361 и № 261.

Конкурс профмастерства по квалификации



«Кузнец ручной ковки» проводился в два этапа. Теоретический тур проходил на компьютерах, были отобраны учащиеся группы № 341, которые выполняли задания в тестовой оболочке Айрен. Задания были составлены преподавателем Лозюком В.М. Тесты содержали вопросы по предметам профессионального компонента: спецтехнологии, материаловедению, черчению, основам экономики.



Для участия в практическом туре конкурса профмастерства по квалификации «Кузнец ручной ковки» мастером производственного обучения Мельниковичем Н.А. были выделены два учащихся группы № 341, имеющие высокие учебные достижения.

Практическая часть заключалась в изготовлении кованной розы. При этом учитывались соблю-



дение ТБ, мастерство и качество работы.

Учащийся группы № 341 Чекун Александр показал высокие достижения в двух этапах конкурса и стал победителем, второе и третье места были присвоены учащимся группы № 341 Станкевичу Илье, Лемешевскому Алексею.

По результатам проведенной учебно-методической недели победители были награждены грамотами и ценными призами, а юношам, занявшим первые места вручены ценные подарки.



*Н.И.Занько,*
*председатель МК*





КОНКУРС ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО МАСТЕРСТВА



БЕЛОРУССКИЙ СТУДЕНЧЕСКИЙ ОТРЯД

## Награждение студенческих, волонтёрских отрядов

13 февраля 2019 г. прошло награждение обучающихся колледжа, проявивших особую активность в общественной и трудовой деятельности молодёжи города и осуществляющих работу посредством временной трудовой занятости в составе студенческих, волонтёрских отрядов. Дипломом в категории "Лучший командир отряда" признан обучающийся группы № 4-А Грушевский Алексей. Благодарностью отмечен колледж за организацию деятельности студенческих отрядов в 2018 г.









УО «ПИНСКИЙ ГПТК МАШИНОСТРОЕНИЯ»

**НАШ САЙТ: www.pgptkm.by**

**Составитель:**
Цеван Ж.Н., методист

**Технический редактор:**
Тихонова С.В., инженер-программист

На основании решения Брестского облисполкома от 12.05.2014 № 367, приказа управления образования № 384 от 19.05.2014 «О реорганизации учреждений профессионально-технического образования», УО "Пинский государственный профессионально-технический колледж машиностроения" реорганизован путем присоединения к нему УО "Пинский государственный профессиональный лицей мебельного производства и автомобильного транспорта"

**Наш адрес:**

**ул. Революционная, 20**
**225710, г. Пинск**
**Брестская обл.**

Телефон: 8 (0165) 34 71 44
Факс: 8 (0165) 34 17 63

**E-mail:**
pgptkm@brest.by



# Выбираем профессию - выбираем будущее

В профориентационной выездной промо-акции «Выбираем профессию - выбираем будущее» на базе ГУО «Средняя школа № 4 г. Иваново приняли участие опытные педагогические работники и учащиеся колледжа. Была организована интерактивная профориентационная площадка, консультирование представителей школ, выставка-продажа продукции колледжа. Участие в акции повышает профессиональную и социальную активность учащихся в профессиональном самоопределении, способствует популяризации рабочих профессий.








**Знание оборотной стороны профессии или призвания – это та цена, которую мы платим за овладение профессиональными навыками.**

*Болдуин Д.*

# Профориентация в шестой школьный день

Учащиеся ГУО «Ставокская средняя школа» Пинского района посетили колледж с целью ознакомления с материально-технической базой учреждения образования, специальностями, условиями обучения и проживания в общежитии, внеучебной работой, деятельностью кружков декоративно-прикладного и технического творчества, спортивных секций.

Школьникам была оказана консультативная помощь в определении будущих профессий, правилах поступления в учреждении образования.








твой выбор

